Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 23 (265) | 14 верасня 1956 года | Цана 20 кап.

Таварышы студэнты!

Парадуем працаунікоу калгасных палёу добрай працай, цікавымі лекцыямі, дакладамі і канцэртамі мастацкай самадзейнасці!

На дапамогу калгаснікам. Фото М. Пільшчыкава.

ВЫКАНАЙ СВОЙ АБАВЯЗАК ПА-КОМСАМОЛЬСКУ!

Гарачы час цяпер у калгаснай вёсцы. Працаунікі сельскай гаспадаркі заканчваюць уборачныя работы, нарыхтоўваюць кармы жывёле, вядуць сяубу азімых, малацьбу. З самага рання і да позняга вечара не змаукае гул матораў на калгасных палях і таках. На нарыхтоучыя пункты ідуць гружаныя машыны з зернем, гароднінай новага ураджаю.

У гэтыя дні на дапамогу сельскім хлебаробам выязджае моладзь прадпрыемстваў, тэхнікумаў, ВНУ. Комсамольцы поўны рашучасці дапамагчы калгасшкам своечасова і без страт убраць багаты ўраджай бульбы, кукурузы і іншых сельскагаспадарчых культур.

Вопыт мінулых год паказаў, што студэнты БДУ імя В. І. Леніна выконваюць свой ганаровы абавязак добрасумленна, па-комсамольску. У прошлым годзе, напрыклад, многія курсы, групы і асобныя комсамольцы універсітэта за час прабывання ў калгасах паказалі узоры самаадданасці ў працы. Добра папрацавалі на уборцы бульбы студэнты IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры, I і IV курсаў хімічнага факультэта, III курса гістарычнага і многія другія.

На старонках нашай газеты былі змешчаны пісьмы брыгадзіраў паляводчых брыгад, старшынь раду калгасаў, якія ад імя калгаснікаў дзякавалі студэнтаў за іх добрасумленную працу.

Але, нажаль, у нашым асяроддзі знайшліся і такія студэнты, якія самі дрэнна працавалі і перашкаджалі другім. Такія выпадкі наглядаліся сярод студэнтаў геолага-геаграфічнага і юрыдычнага факультэтаў.

У некаторых групах студэнты ў рабочы час знікалі ў горад, учынялі п'янкі, паказваючы гэтым дрэнны прыклад калгаснікам.

Высокая працоўная дысцыпліна—важнейшая ўмова паспяховай працы. Своечасова выходзіць на работу, працаваць з аганьком, выконваць усе даручэнні сваіх кіраунікоу і старэйшых таварышаў—усё гэта павінна стаць абавязковым правілам кожнага студэнта.

Выхаваучая работа сярод студэнтаў у гэты час павінна асабліва знаходзіцца на высокім узроуні. Кіраунікі груп, партыйны і комсамольскі актыу павінны прыкласці усе намаганні, каб кожная група стала дружным, моцным калектывам. Неабходна арганізаваць работу так, каб кожны вечар студэнты ведалі вынікі сваей работы за дзень. Гэта дасць магчымасць сістэматычна абмяркоўваць работу кожнага і выяўляць тых, хто недобрасумленна працуе, усяляк ухіляецца ад работы. Для гультаёў патрэбна стварыць нецярпімае становішча — крытыкаваць іх на сходах, у «баявых лістках».

Кіраўнікі груп павінны паклапаціцца аб быце студэнтаў, культурным іх адпачынку. Добра аргашзаваны, вясёлы, культурны адпачынак павышае актыўнасць комсамольцаў, забяспечвае больш высокі поспех у працы. Вельмі важна, каб нашы комсамольцы аказалі сельскай моладзі практычную дапамогу ў наладжванні культурна-выхаваўчай работы. Заслугоўвае пахвалы, напрыклад, работа ў гэтым напрамку ў час працы ў калгасах у мінулым годзе студэнтаў II курса геолага-геаграфічнага факультэта, дзе кіраўніком быў В. Касцоў. Комсамольцы гэтага курса—Ядвіга Татарынава, Міхаіл Казёл, Уладзімір Шапоцька, Зінаіда Чыкілёва дапамаглі калгаснікам графічна афарміць вітрыну аб поспехах калгаснага жыцця. Студэнты гэтага курса разам з комсамольцамі сельгасарцелі правялі сход, дзе абмеркавалі ход уборкі бульбы.

Усебаковая дапамога калгасам—наш ганаровы абавязак, і выканаць яго мы павінны па-комсамольску.

Каб ведаць новыя правілы

У 1956 годзе выйшлі ў свет новыя правілы па рускай арфаграфіі і пунктуацыі. Кабінет рускай мовы і агульнага мовазнаўства будзе весці сваю работу з улікам іх.

Задача кабінета—навучыць студэнтаў і аспірантаў у хутчэйшыя тэрміны ўжываць новыя правілы. Кабінет набыў 30 экземпляраў гэтай кнігі. Студэнты могуць атрымаць у кабінеце кансультацыю па няясных пытаннях у вывучэнні іх.

Выхад у свет новых правілау унёс змены ў пабудову курсау лекцый розных мовазнаучых дысцыплін. Так, на 5 курсе філалагічнага факультэта будуць арганізаваны спецыяльныя практычныя заняткі па вывучэнню змен у ранейшым правапісу і пунктуацыі. Кабінет рускай мовы і агульнага мовазнаўства будзе ў гэтым аказваць дапамогу.

І. БІРАЛА,
лабарантка кабінета рускай мовы і агульнага мовазнаўства.

ПА УНІВЕРСІТЭТУ

* * *

ДЛЯ ДЫПЛОМНІКАЎ

Пры напісанні дыпломных работ студэнты-выпускнікі часта сустракаюцца са значнымі цяжкасцямі: не ведаюць, як аналізаваць той ці іншы твор, як скласці план, у якой паслядоунасці размясціць матэрыял. Таму, акрамя кансультацый па гэтаму пытанню выкладчыкамі, кабінетам рускай і зарубежнай літаратур арганізоуваецца вітрына у дапамогу дыпломнікам і членам Студэнцкага навуковага таварыства.

У гэтай вітрыне будуць змешчаны план і схема асобных дыпломных работ, прапанаваных кафедрамі зарубежнай і рускай літаратур. Выпускнікі даведаюцца, на якія пытанні трэба звяртаць асноуную увагу, якую літаратуру выкарыстоуваць, як складаць план.

Акрамя гэтага у канцы верасня будзе арганізавана выстаука, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння вядомага кітайскага пісьменніка Лу Сіня. У далейшым, выстаукі будуць прысвячацца творчасці І. Вазава, А. Гайдара, Н. Ціханава і іншых пісьменнікаў.

Г. МАЗАНІК.

КАРЫСНЫЯ НАВЫКІ

Сноп яркага полымя з шумам вырываецца з шкловыдзімальнай лямпы. Цесным гуртком стаяць студэнты навокал пажылога мужчыны і сочаць за доугай шклянай трубкай, якую ён трымае над полымем. У руках шкловыдзімальшчыка чырвоная ад напалу трубка выцягваецца як рызіна, робіцца усё таней і таней. Праходзіць некалькі секунд—і на канцы яе з'яуляецца невялічкі чырвоны пузыр, нагадваючы усім вядомыя мыльныя пузыры. Ён расце і грае рознымі колерамі. Але вось шкло застыла, і студэнты бачаць перад сабой звычайную колбу.

Шкловыдзімальшчык Нікалай Антонавіч Дубовік робіць лебедзя, чайнік з прыгожай фігурнай ручкай і, нарэшце, паказвае, як гнуць шкляныя трубкі пад прамым вуглом.

— А цяпер,—гаворыць ён,—паспрабуйце самі сагнуць трубку.

Першым падыходзіць да стала Анатоліи Лосеу. Ён доуга і старанна трымае трубку над полымем, але сагнуць яе не удаецца—шкло у тым месцы, якое прагрэлася, скручваецца як вяроука.

— Трэба своечасова дуць,—указвае на памылку студэнта Нікалай Антонавіч.

Па чарзе падыходзяць першакурснікі да шкловыдзімальнай лямпы. Пакуль што яшчэ нямногім удаецца зрабіць тое, што трэба.

— Вось у яе атрымалася лепш за усіх,—чуецца шэпт, калі ад стала адыйшла Галіна Дудзіна. Вельмі хочацца студэнтам яшчэ раз паутарыць пробу, але раздаецца званок.

Усяго адну гадзіну правялі студэнты I курса хімічнага факультэта у шкловыдзімальнай майстэрні, але яна прайшла вельмі цікава.

Знаёмства з шкловыдзіманнем дае студэнту магчымасць пры дапамозе простай паяльнай лямпы рабіць з шкляных трубак прабіркі, з прабірак колбы, гнуць трубкі пад прамым вуглом, упойваць іх у прабіркі, рамантаваць рознастайныя шкляныя прыборы і рабіць многа іншых рэчаў, неабходных таму, хто займаецца хіміяй. Гэтыя практычныя навыкі можна атрымаць літаральна за гадзіны. Але заняткі у шкловыдзімальнай майстэрні, нажаль, не прадугледжаны вучэбным планам. А у школьнай лабараторыі многа шкляных прыбораў. Сённешні студэнт, будучы педагог, павінен добра ведаць асновы шкловыдзімання. Таму у сценах універсітэта студэнтаў трэба больш знаёміць з гэтым працэсам.

А. АЛЕЖКА.

У БАТАНІЧНЫМ САДЗЕ БДУ

* *

Гарачая пара зараз у работнікаў батанічнага сада, які раскінууся на тэрыторыі універсітэцкага гарадка. Ідзе збор насення і пладоу вырашчаных тут раслін. На розных участках гэтага сада налічваецца больш 800 відаў раслін, у тым ліку—соя, кукуруза, афрыканскае проса, чуміза, сарго, кенаф, ватачнік, раннія меданосы, эфіраносы, дэкаратыўныя, лекавыя, тэхнічныя і іншыя дрэвы.

Закончыцца збор насення і пладоу, і пакецікі з імі разайдуцца у розныя месцы—школы і навукова-даследчыя ўстановы Беларусі.

* *

НА ЗДЫМКАХ: 1. Дырэктар батанічнага сада Аляксандра Канстанцінаўна Ефрэмкіна за зборам пладоў лімона сорта «Кітайскі». 2. Работнікі батанічнага сада А. Д. Назулька (злева) і А. А. Асташонак збіраюць насенне глазурнага ауса і сарго.

Фота М. Пільшчыкава.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧУЮ І ВЫХАВАЎЧУЮ РАБОТУ—НА НАЛЕЖНЫ ЎЗРОВЕНЬ

Днямі адбыуся агульнауніверсітэцкі адкрыты партыйны сход. З дакладам аб задачах партыйнай арганізацыі універсітэта у новым навучальным годзе выступіў прарэктар універсітэта па навуковай рабоце Г. А. Павецьеу.

Дакладчык і выступаушыя (П. Г. Пятровіч, Г. В. Булацкі, Б. Н. Березін, І. Г. Цішчанка, Н. А. Сакалоуская і інш.), адзначыушы некаторыя дасягненні, асноуную увагу удзялілі ускрыццю недахопаў у дзейнасці дэканатаў, кафедр і асобных выкладчыкаў.

Галоунымі задачамі, пастауленымі XX з'ездам партыі перад вышэйшай школай, з'яуляюцца—усямернае палепшанне якасці падрыхтоукі спецыялістаў на аснове умацавання сувязі навукі з вытворчасцю.

Калектыу навуковых работнікаў прарабіу значную работу. У гэтым годзе дэканаты, кафедры, выконваючы указанні партыі, правялі значную работу па ліквідацыі многатэмнасці у навуковай дзейнасці. Так, увесь калектыу навуковых работнікаў універсітэта зараз працуе над вырашэннем 36 комплексных тэм, якія маюць вялікае народнагаспадарчае значэнне. 4 навуковыя праблемы зацверджаны Прэзідыумам АН СССР, над якімі творча працуюць прафесары нашага універсітэта Т. Н. Годнеу, Г. Г. Вінберг, М. М. Паулючэнка, калектыу кафедры фізікі і электрафізікі вядзе вялікую работу у вобласці поуправаднікоу. Калектывы біялагічнага, фізіка-матэматычнага, хімічнага, геаграфічнага факультэтаў дабіліся некаторых поспехаў у правядзенні вытворчай практыкі. Так, студэнты-біёлагі у мінулым навучальным годзе працягвалі работу над састаўленнем глебавых карт Дзержынскага раёна, студэнты-географы правялі вытворчую практыку па канкрэтнаму заданню работнікаў сельскай гаспадаркі. Матэрыялы практыкі з'явяцца вялікай дапамогай працаунікам калгасных палёу.

Аднак у дзейнасці многіх кафедр маецца яшчэ рад сур'ёзных недахопаў. Тэматыка іх навукова-даследчай работы распылена, калектывы такіх кафедр не накіроуваюць усіх сваіх намаганняў на вырашэнне важнейшых народнагаспадарчых праблем, яшчэ многія з іх не устанавілі цеснай сувязі з вытворчасцю.

У новым навучальным годзе Міністэрствам вышэйшай адукацыі праведзен рад мерапрыемстваў, накіраваных на значнае палепшанне навукова-даследчай работы. Педагагічная нагрузка прафесарска-выкладчыцкаму саставу будзе планавацца дыферэнцыравана у адпаведнасці з тым, якую навуковую праблему ён вырашае, што у значнай ступені будзе садзейнічаць паспяховаму развіццю навукова-даследчай работы.

У бягучым навучальным годзе рад кафедр расшыран, адкрываюцца новыя. Гэта дае нам магчымасць развіваць новыя напрамкі у навуцы.

Партыйны сход аднадушна падкрэсліу неабходнасць палепшання вучэбна-выхаваучай работы. Факты, якія мелі месца у канцы мінулага навучальнага года, сведчаць аб недахопах у гэтай справе. Чым, як не безадказнасцю можна вызначыць той факт, што нскалькі дзесяткаў студэнтаў-выпускнікоу атрымалі на дзяржауных экзаменах здавальняючыя адзнакі, рад студэнтаў—нездазальняючыя. Пры праверцы аказалася, што усе яны на працягу пяці год вучобы атрымлівалі «добра» і «выдатна» па гэтым прадметам. Падобны факт з усёй красамоунасцю сведчыць аб лібералізме асобных выкладчыкаў. Партыйны сход абавязау дэканаты і выкладчыкаў значна павысіць патрабазальнасць у час экзаменау і залікаў.

Партыя і Урад надаюць першаступеннае значэнне пытанням зазочнага навучання. Выконваючы рашэнні партыі, Беларускі універсітэт з кожным годам павялічвае падрыхтоуку спецыялістаў на зазочным факультэце. Толькі у 1956 годзе зазочны факультэт закончыла 335 высокакваліфікаваных спецыялістаў, прынята на першы курс 540 чалавек. У 1956—1957 навучальным годзе на зазочным факультэце будзе навучацца звыш грох тысяч чалавек. Пераважная большасць—гэта людзі з вытворчасці: настаунікі, работнікі друку, рабочыя, калгаснікі.

Аднак зазочнае навучанне у нашым універсітэце усё яшчэ не стала арганічнай часткай усёй работы кафедр і факультэтаў, у выніку чаго узровень зазочнага навучання яшчэ не адпавядае запатрабаванням універсітэцкай адукацыі. Зазочнае навучанне яшчэ не выкарыстоуваецца як форма паглыбленай сувязі ВНУ з вытворчасцю. Кафедры слаба удзельнічаюць у арганізацыі вучэбнага працэсу на зазочным факультэце. Выкладанне тут даручаецца менш валіфікаваным выкладчыкам. Так, у мінулым навучальным годзе з 127 выкладчыкаў, якія працавалі з зазочнікамі, быу толькі адзін прафесар і адзін доктар навук. Зусім не распрацоуваецца методыка зазочнага навучання.

Уся гэтая работа па падрыхтоуцы спецыялістаў на зазочным факультэце павінна быць карэнным чынам палепшана у новым навучальным годзе. Дэканаты, кафедры павінны забяспечыць своечасовую падрыхтоуку неабходнай вучэбна-метадычнай літаратуры для студэнтау-зазочнікау, палепшыць работу кафедр, выкладчыкаў са студэнтамі у перыяд паміж сесіямі.

Вялікія і адказныя задачы выкладчыка вышэйшай навучальнай установы. Яму даручан лёс будучага спецыяліста, так патрэбнага Радзіме. Але не усе выкладчыкі гэта разумеюць. Некаторыя з іх чытаюць лекцыі шэра і нецікава. Безумоуна, такія лекцыі студэнты слухаюць з неахвотай. Дакладчык і выступаушыя прыводзілі прыклады дрэннай работы выкладчыкау Міхайлава (фізмат), Хацкевіч, Цімафееваі (філфак), Чаплінскай (кафедра палітэканоміі). Гэтыя факты —сведчанне несур'ёзных адносін выкладчыкау да сваёй справы.

З мэтай удасканалення педагагічнага майстэрства, абмена вопытам работы, карэннага палепшання метадычнай работы кафедр, выкладчыкау у кастрычніку бягучага года будзе праведзена II метадычная канферэнцыя БДУ. Сход выразіу упэўненасць, што гэтая канферэнцыя, дзе будзе прачытана звыш 80 дакладау, адыграе выключна важную ролю у справе палепшання педагагічнага працэсу.

Гістарычныя рашэнні XX з'езду КПСС, пастанова ЦК аб пераадоленні культу асобы і яго выніках ускладаюць вялікія задачы на партыйную арганізацыю і увесь калектыу універсітэта. Выключна важныя задачы стаяць перад кафедрамі соцыяльна-эканамічных дысцыплін. Яны павінны у першую чаргу павесці рашучую барацьбу супраць дагматызма і начотніцтва, творча распрацоуваючы пытанні марксісцка-ленінскай ідэалогі.

Чым, як не нізкім ідэалагічным узроунем можна растлумачыць той факт, што у нас яшчэ часты выпадкі амаральных паводзін студэнтау?

Сход абавязау партыйны камітэт, комсамольскую і прафсаюзныя арганізацыі значна палепшыць палітыка-выхаваўчую работу сярод студэнтаў, цесна увязваючы усе формы выхавання з задачамі комуністычнага будаўніцтва.

Калектыу выкладчыкау і студэнтаў, знаходзіцца зараз у росквіце сваіх творчых сіл. Узброеныя гістарычнымі рашэннямі XX з'езда КПСС прафесары і студэнты—увесь многатысячны калектыу універсітэта прыкладзе усе свае сілы на далейшае палепшанне навукова-даследчай, вучэбна-выхаваўчай і ідэалагічнай работы універсітэта.

В. АЛЯКСЕЕЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: На днях да нас прынеслі пісьмы студэнтаў нашага універсітэта, якія працуюць на цалінных землях. Ніжэй мы змяшчаем іх.

...У нас так весела, жыццё настолькі багата ўражаннямі. Харастно, а не жыццё! Мяне канчаткова зачаравалі стэпавыя прасторы, стэпавая цішыня і мора пшаніцы. Пшаніца усюды, і усюды багатая!

А у нашай брыгадзе паяуляецца на свет новы дом! Будаунікі—мы. У суседстве з двума вагончыкамі і нашай палаткай гэтае земляное збудаванне (мы яго будуем з земляных пластоу) здаецца казачным палацам. Мы поунімся гордасцю. Але, сапрауды, гэта цудоуна! За чатыры дні узвялі сцены, застауся дах.

Сёння, у нядзелю, да абеда працавалі, а пасля абеда усе паехалі на Табол адпачываць, а я схадзіла на свой «бліжэйшы Табол» і вось пішу. Жывем, не тужым. Воду возяць за 6 км. Прауда, яна крыху салаватая на смак, таму кожную раніцу нам дастауляюць воду з цэнтральнага катлавана.

Жывем у палатках—дзяучаты уладкаваліся на раскладных ложках, а хлопцы—на боранах. Але ім нікольні не горш за нас, нават рамантычней! Больш утульны выгляд нашаму жыллю прыдае «самы юны механізатар»—так мы акрысцілі свайго цалінnага ката, якога прывезлі з цэнтра. Ён наш агульны любімец.

...Толькі што прыехалі нашы з Табола. Прывезлі лілп. Якія ліліі! І яшчэ прывезлі прывітанні ад студэнтаў другой брыгады, ад Колькі Рожына. Ён—начальнік—загадчык цэнтральнага тока!

А як цудоуна праходзяць у нас вечары! Каб вы толькі ведалі! Учора танцавалі барыню усім гуртам, палілі саламяны касцёр ад камароу (трэба сказаць, што камары тут ліхія—бытуе тэрмін «мічурынскія»), вакол кастра спявалі і пра «бабу» і пра «гарох», і развучвалі пад мудрым кіраўніцтвам Рычарда масавую чэшскую польку. Часта пяем пад гітару. Наша любімая песня—«Шэравокая». Ці-ж можна забыць такія вечары!

Пасябравалі з «карэннымі» цалінnікамі. Якія яны цудоуныя хлопцы! А як яны хораша спяваюць! Больш за усё нам тут падабаюцца людзі. Цудоуныя, сапраўдныя людзі—«карэнныя» цалінnікі. Мы з імі так добра сябруем! А якой павагай, як цёпла, па-таварыску яны да нас ставяцца! І мы, безумоуна, таксама. Як мне хочацца, каб вы пабывалі тут самі! Жывем мы тут, і усё больш любім сваіх совецкіх людзей!

Харчуемся нядрэнна. Сумуем па газіраванай вадзе. Вось прыедзем, адвядзем душу!

У вольны час рашылі вучыцца польскай мове. Настаунікам згадзіуся быць Рычард. Пакрысе усвойваем украінскую мову. У нас ёсць радыё, акардыён, валейбол, шахматы. Чытаем кнігі, чакаем ад вас пісем.

Жывем тут усе вельмі дружна. Складаем свае уласныя прыпеукі, ходзім за кветкамі у стэп, загараем. Некаторыя сталі зусім чорныя.

Канчаю. Нас клічуць есці. Наш повар Насценька, варыць такія смачныя баршчы!

З шчырым прывітаннем

В. ГРЫШЧАНКОВА.

* * *

...Тут проста цудоуна, усе звяртаюцца адзін да другога на «ты», як да сяброу. А якія цалінnікі! Яны—сапраўдныя героі! Іх 300 чалавек. Зімавалі яны у брызентавых палатках, а за гэтыя месяцы пабудавалі каля 40 дамоу, засеялі 32.000 га! Уяуляеце, колькі зрабілі, а пачыналі-ж на голым месцы!

Учора мы былі на танцах у клубе цалінnікаў. Многім нашым юнакам патрэбна павучыцца скромнасці у іх, у гэтых простых рабочых хлопцаў. Дапішу потым, спяшаюся з Рычардам дамауляцца аб вечары самадзейнасці.

...Дапісваю праз дзень. Учора увесь дзень быу мітуслівым: былі на працы, палолі кукурузу, загарэлі. Да канца работы будзем зусім чорнымі. У полі нас застала навальніца! Вечарам палатку нашу ледзь не сарвала ветрам, мы усе яе утрымлівалі, нам дапамагау нават Бабосау!

Дамовілся правесці у нядзелю дзень адпачынку з спаборніцтвамі па плаванню, валейболу, з канцэртам, дзе мы будзем спяваць пад гітару.

Усе філолагі квітнеюць, ружавеюць і наліваюцца здароуем. Ад усёй брыгады слауных філолагау нашы прывітанні.

* * *

...Працуем многа. Пальцы у суставах баляць ад лапаты. А на таку яшчэ горы пшаніцы. Яе трэба сушыць, каб здаць дзяржаве, а тут дажджы, трэба сачыць, каб пшаніца не прамакала. Вось цяпер мы зразумелі, што гэта такое дапамагчы краіне хутка і без страт сабраць багаты ураджай. Гэта значыць з 7 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы капаць у пшаніцы траншэі і акопы, а ноччу выгружаць з прыбываючых машын збожжа.

Ведаеце, як цяжка працаваць днём з-за жары. Тут часам тэмпература даходзіць да 40 градусау.

Але у нас цікава, хоць і цяжка. У нашай брыгадзе усё робіцца уручную, а у другіх ёсць усякія зернеачышчалкі, зернепульты і г. д. Але наша брыгада усёроуна выбіваецца на першае месца.

Да, уявіце, у нас з сёнешняга дня бясплатны хлеб, зусім без грошаи і колькі хочаш. Вось здорава! Як пры комунізме!

Кніг мы зусім не чытаем, няма калі, а газеты—з тыднёвым спазненнем. О, абед канчаецца, канчаю пісаць і я.

З прывітаннем.

І. КІСЯЛЁВА.

У нашай брыгадзе

Дзе-б ні збіралася наша моладзь, там заусёды узнікае песня. Так адбылося і на гэты раз: не паспеу ціхі начны змрок акутаць брыгадны стан 4-аій паляводча-трактарнай брыгады, як узнікла гэтая песня... «Едем мы друзья в дальние края...» заспявалі яе студэнты-філолагі па просьбе сваіх новых таварышау—механізатараў зернесоўгаса імя Фрунзе.

Моцна пасябравалі мы з імі: разам працуем, разам адпачываем.

Прыпамінаецца першы сход у брыгадзе. Стомленым ад бяссонных начэй голасам намеснік дырэктара зернесоугаса тав. Чарануха расказау аб плане ууоркі ураджаю. Потым брыгадзір назваў некалькі лічбаў... Брыгадай было вырашчана 4 тысячы гектараў яравой пшаніцы. «Плошча вялікая, убраць ураджай з яе зможам толькі пры максімальным напружанні усіх нашых сіл»—гэтыя словы брыгадзіра былі зразумелы кожнаму, хто прысутнічаў на сходзе. Патрэбна было прадугледзець усё да самых дробных дэталяу.

Пад адкрытым небам, пры свеце аутамабільных фар людзі з усіх канцоу краіны—механізатары з Украіны, студэнты з Беларусі намячалі план вялікай барацьбы за ураджай.

На другі дзень усе камбайны выйшлі у поле. Зярно было яшчэ сыраватым, давялося рассцілаць на таку і пералапачваць па некалькі разоу. У першы-ж дзень мы намалацілі каля 150 тон. Але сярод нас аказаліся студэнты, якія любілі пабольш адпачыць. Па іх віне падапрэла некалькі тон зерня, зваленага у кучы.

Комсамольскі актыу брыгады студэнтау на чале з брыгадзірам Яскевічам прабіу трывогу. Тэрмінова быу склікан комсамольскі сход. Былі ускрыты усе недахопы у нашай рабоце. Нерадзівых і лянівых студэнтау сурова крытыкавалі таварышы. На сходзе былі выбраны члены рэдкалегіі брыгаднай насценгазеты у складзе студэнтау аддзялення журналістыкі В. Пауловіча, І. Кірэенкі, С. Куц. Хутка былі выпушчаны два баявыя лісткі.

Наладжвалася работа на таку. Створаныя студэнцкія комсамольскія пасты дапамагалі актывізаваць работу брыгады.

Добрыя вынікі на уборцы ураджаю паказалі студэнты аддзялення беларускай мовы і літаратуры Генадзій Несцяровіч, Іван Саламевіч, Паша Старавойтава, студэнты-журналісты Віктар Карамазау, Уладзімір Пауловіч, студэнты аддзялення рускай мовы і літаратуры Тамара Дземьянава, Таіса Мішурная, Люся Якубенка і іншыя. Усе яны перавыконваюць нормы выпрацоукі у 2—3 разы.

Ідуць апошнія дні ууоркі ураджаю. Члены нашай брыгады прыкладаюць максімум намаганняу, каб закончыць агульныя работы на таку у карацейшы тэрмін.

В. ДАШУК,
студэнт 2 курса аддзялення журналістыкі.

НА ЗДЫМКУ: Студэнты пералапачваюць зярно.

Фота аутара.

Аб адным *ПЛАГІЯЦЕ*

У красавіку—маі месяцы мінулага навучальнага года праходзіў гарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ. Наш універсітэт прадставіў работы студэнтаў розных факультэтаў. Лепшыя з іх атрымалі высокія адзнакі.

На агляд была прадстаулена і работа студэнта III курса юрыдычнага факультэта Д. Сіроціна «Крымінальная адказнасць за неданясенне».

Што-ж уяўляе сабой гэтая работа?

Твор студэнта Сіроціна з'яўляецца плагіятам у самым агідным яго выглядзе. «Аутар» даслоўна ад пачатку да канца перапісаў прадстауленую раней на гарадскі агляд і атрымаўшую станоучую ацэнку работу былога студэнта юрыдычнага інстытута тав. Ляса. Прычым, спісванне зроблена з грубымі памылкамі і скажэннямі. Так, на стар. 15 работы студэнта Ляса гаварылася аб тым, што для вырашэння пытання аб адказнасці за неданясенне не мае значэння суб'ектыуная пераконанасць аб тым, маюць патрэбу органы улады у яго паведамленні, ці такая патрэба ужо мінавала. У Сіроціна-ж, даслоуна спісаушага адпаведную фразу, суб'ектыуная пераконанасць ператварылася у судовую. На першай старонцы груба скажона цытата з 26 тома Твораў В. І. Леніна.

Студэнт Сіроцін не карыстауся пры напісанні работы ні падручнікамі, ні артыкуламі, апублікаванымі у часопісу «Социалистическая законность», ні часопісам «Практика Верховного суда СССР», ні работай Т. Л. Сяргееваи «Уголовно-правовая охрана социалистической собственности в СССР». Аднак у спісу выкарыстанай літаратуры і у зносках работы Сіроціна яны указаны. Забыуся «аутар» упамянуць адзіную выкарыстаную ім крыніцу (калі не лічыць частковага выкарыстання ім брашуры дацэнта Гарэліка)--работу студэнта Ляса.

«Самастоінасць» Сіроціна у «распрацоуцы» тэмы звялася да таго, што у прыкладах з судовай практыкі, запазычаных з работы Ляса, замест артыкулаў КК РСФСР, указаны артыкулы КК БССР або тыя і іншыя. Пры гэтым «аутар» не улічыу таго, што нельга асудзіць па КК БССР, калі злачынства зроблена на тэрыторыі РСФСР. Не прыкмеціу гэтага і дацэнт Гарэлік.

У рабоце маецца цэлы рад граматычных памылак і няудалых у стылістычных адносінах выразаў, якія з'явілися, галоуным чынам, вынікам неахайнага спісвання з добра напісанай работы т. Ляса. Яшчэ больш неіспьменна сфармуляваны тыя радкі, якія напісаны самім Сіроціным.

Незразумела, як хапіла у Сіроціна сумлення падаваць на гарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ чужую работу пад сваім прозвішчам. Яшчэ больш незразумела тая захапляючая ацэнка, якую дау рабоце навуковы кіраунік—дацэнт Гарэлік. У сваёй рэцэнзіі ён указвае: «Выбраная аутарам тэма у апублікаваных артыкулах распрацавана недастаткова... У прадстауленай рабоце аутару удалося даць змястоуную характарыстыку пытанняу тэмы. Законадаўства і судовая практыка выкарыстаны з веданнем справы(?!). Аутар выказвае рад аргументаванных крытычных заувар адносна прапаноу, выказаных у літаратуры(!!)... Праца тав. Сіроціна можа быць вучэбным дапаможнікам для вывучэння законадаўства аб адказнасці за неданясенне, заслугоувае прадстаулення на гарадскі агляд студэнцкіх работ і станоучай адзнакі на апошнім».

Такім чынам, дацэнт Гарэлік лічыць неабходным прапанаваць работу Сіроціна у якасці вучэбнага дапаможніка!

Дацэнт Гарэлік не мог не зауважыць, што першая старонка напісанай пад яго кіраунцтвам і ім адрэцэнзіраванай работы т. Сіроціна запазычана з яго-ж, Гарэліка, брашуры.

Вельмі непрыемнае уражанне пакідае падкрэсліванне Сіроціным правільнасці поглядау дацэнта Гарэліка, выказаных ім у невялікім артыкуле, апублікаваным у 1950 годзе у часопісе «Социалистическая законность». На памылкі І. І. Гарэліка, якія маюць месца у гэтай рабоце, указвалася у свой час на адным з пасяджэнняу кафедры, дзе сам тав. Гарэлік не мог пярэчыць супраць выказаных тады крытычных заувар.

Паустае пытанне, чаму-ж ён не растлумачыу студэнту Сіроціну, да якіх няправільных вывадау прыводзіць гэтая памылковая думка?

Як магла падобная праца трапіць на гарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ?

А. ХМЫЛЬ.

АГЛЯД ДРУКУ

„МУССОР И ВСЯКАЯ ВСЯЧИНА"

Не здзіўляецеся, таварышы гэтаму загалоўку, яшчэ і не такія «перлы» пісьменнасці і красамоуства можна сустрэць на старонках насценнай газеты «Універсітэцкі работнік» — органа партыйнай, профсаюзнай і комсамольскай арганізацый адміністрацыйна-гаспадарчай часткі БДУ.

У газеце нямала бессэнсоунасці і парушэння самых элементарных правіл рускай граматыкі і правапісу, вядомых вучню 7-га класа. Так, замест рускага слова «мусор» напісана «муссор», замест «здесь» —«сдесь». Можна прывесці яшчэ многа прыкладау абураючай непісьменнасці. У заметцы «Новая пральня» гаворыцца: «У жніуні месяцы выйшла у строй доугачаканая пральня». І далей: «...цяпер пральня універсітэта у стане поунасцю забяспечыць мыццём універсітэцкай бялізны». Каментыраваць гэтую бязглуздзіцу няма патрэбы.

Атрымоуваецца у газеце «муссор и всякая всячина» таму, што тав. Крауцоу (рэдактар газеты) не правярае нумар перад тым, як ён выходзіць у свет. Зразумела, што такія безадказныя адносіны да даручанай справы могуць прывесці не толькі да «муссора», але і да чыстага смецця у газеце.

Да гэтага трэба яшчэ дабавіць і тое, што газета выходзіць ад выпадку да выпадку. Гэта другі нумар у 1956 годзе. Можна падумаць, што няма аб чым пісаць. Нажаль, гэта не так. Ва універсітэце вядзецца вялікая гаспадарчая работа. Маюцца тут і поспехі і недахопы. Ці дапамагае газета вырашэнню гэтых задач?. Можна з упэуненасцю сказаць —не.

Партыйнаму бюро адміністрацыйна-гаспадарчай часткі (сакратар партбюро т. Ф. Пасько) дауно пара пацікавіцца работай рэдкалегіі і яе кіраўніка П. А. Крауцова.

Г. ГЕОРГІЕЎ.



ПРАКТЫКА ЖУРНАЛІСТАЎ

У розных кутках краіны праходзілі практыку студэнты 3 курса аддзялення журналістыкі. Большасць з іх працавала у рэдакцыях раённых газет Беларусі. Некаторыя праходзілі яе за рубяжамі рэспублікі—У Адэсе, Малдавіі, на Далёкім Усходзе.

Практыка прынесла студэнтам шмат новых уражанняу. Яна дала магчымасць кожнаму уявіць сабе цяжкасці журналістскай работы, набыць першыя практычныя навыкі. І тыя, хто сур'ёзна аднёсся да практыкі, атрымалі ад яе многа карыснага.

— Калі мне у першы раз даручылі выканаць заданне рэдакцыі, я не уяуляу сабе, што рабіць, з чаго пачынаць,—гаворыць Нікалай Сокалау.—А з апошнімі заданнямі я спраўляуся ужо даволі хутка.

Многія студэнты з усмешкай успамінаюць, як яны у першы раз выязджалі на месца для збору матэрыяла. Ходзіш, распытваеш, запісваеш усё, што бачыш і чуеш. А толькі пачнеш пісаць, адразу-ж становіцца зразумелым, што сабраў вельмі мала фактау. Але з кожным выездам на месца менш і менш становіцца «прапушчаных» фактаў, непадмечаных дэталяў.

— Практыка навучыла мяне многаму—гаворыць Уладзімір Скапа.

Ён добра папрацаваў летам і прывёз ва універсітэт шмат сваіх матэрыялау.

Але некаторыя са студэнтаў за час практыкі амаль нічога не зрабілі. Калі у рэдакцыю Новагрудскай раённай газеты прыбылі студэнткі Дзіна Праверзева і Таццяна Булгакава; іх сустрэлі вельмі ветліва. Калектыу рэдакцыі спадзяваўся, што практыканткі змогуць замяніць двух супрацоунікаў газеты, якія паехалі ва універсітэт здаваць экзамены на завочным факультэце. Але Праверзева і Булгакава амаль не працавалі. Яны рэдка выязджалі у калгасы, нават у рэдакцыі іх бачыли не часта.

Часам студэнты скардзяцца на тое, што іх не вельмі ветліва сустракаюць у рэдакцыях.

Гэта здарылася у выніку недобрасумленных адносін да практыкі некаторых з нашых папярэднікаў. Яны аставілі там аб сабе нядобрую памяць. Можна упэунена сказаць, што пасля Праверзевай і Булгакавай у Новагрудку не дужа захочуць мець практыкантау з універсітэта.

Вынікі першай практыкі патрабуюць падрабязнага аналізу не толькі з боку выкладчыкау, але і з боку саміх студэнтау. Гэта дапаможа будучым журналістам глыбей пазнаёміцца з практычнымі дасягненнямі сваіх таварышаў і у дальнейшым пазбегнуць памылак, дапушчаных у час практыкі.

Вельмі важна і тое, што практыка дапамагае студэнтам выявіць свае адносіны да работы газетчыка.

Не сакрэт, што на аддзяленні журналістыкі частыя выпадкі расчаравання у сваёй прафесіі. Некаторыя студэнты думаюць, што работа журналіста заусёды лёгкая і прыемная. Але тыя, хто пабывау на практыцы, ведаюць цяжкасці, з якімі даводзіцца сустракацца газетчыку. І не дзіуна, калі у студэнтау, якія лічаць журналістыку лёгкай работай, адпадае жаданне працаваць у газеце.

Практыка гэтага года, здаецца, не дала такіх расчараванняу у сваёй прафесіі.

Усе студэнты сходзяцца у думцы, што практыка прынесла ім вялікую карысць. Многія практыканты друкавалі фельетоны, нарысы, замалёукі. Гэта дапамагло ім выявіць свае здольнасці у розных жанрах...

Увогуле, практыка у раённых газетах дала студэнтам многа цікавага і карыснага.

А. ПУСТАХОД,
О. СЦЕПАНЕНКА.

НА ЗДЫМКУ: Група студэнтау III курса аддзялення журналістыкі дзеліцца уражаннямі аб праведзенай практыцы у рэдакцыях газет.

Фота П. БЕРАЖКОВА.

Зноў за кнігу. Студэнтка аддзялення беларускай мовы і літаратуры Людміла Спірыдзёнак з першых дзён заняткаў пачала сур'ёзна вывучаць праграмную літаратуру.
Фота М. Пільшчыкава.

Падарожжа вакол Еўропы

І ліпеня г. г. група беларускіх турыстаў адправілася у Ленінград, адкуль разам з турыстамі іншых гарадоу павінна была адправіцца вакол Еуропы на цеплаходзе «Победа».

Развітанне з Ленінградам і яго жыхарамі было незабыуным. Гэта-ж было развітанне з Радзімай, хаця і на кароткі тэрмін, але кожны з нас сумаваў. Тысячы ленінградцаў прышлі праводзіць нас.

Шлях да Швецыі, першай краіны, у якую мы прыбылі, прайшоу хутка. 5-га ліпеня мы прыводзілі у парадак сваё адзенне, купаліся у басейне. Вельмі ажыулена было на палубах нашага цеплахода 6-га ліпеня. Пачынаючы ужо з 4—5 гадзін раніцы шчоукалі фотаапараты, раздаваліся воклічы захаплення прыгожымі швецкімі пейзажамі. З двух бакоу цеплахода віднеліся цудоуныя гарыстыя берагі, пакрытыя высокімі дрэвамі.

Нарэшце, паказауся Стакгольм з яго высокімі будынкамі, шматлікімі астравамі і каналамі.

У 9 гадзін раніцы мы выйшлі на бераг. Многія з нас упершыню сталі на чужую зямлю і адчувалі сябе вельмі насцярожана. Прычынай паслужыла вялікая колькасць паліцэйскіх у порце.

Хутка нас пасадзілі на аутобусы і мы разам з экскурсаводам пакінулі гарадскую гавань—Статсгордзен і паехалі аглядаць горад.

Стакгольм раскінууся на 14-ці астравах. Пры аглядзе яго з паудзённых вышынь у вочы кідаецца вялікая колькасць вады і мастоу. Горад дзеліцца на Стары горад і Новы. Стары горад характэрны вельмі вузкімі вулічкамі, будынкамі старой архітэктуры. У Новым-жа Стакгольме планіроука іншая: шырокія вуліцы, высокія дамы, якія маюць форму каробак. Але прыемна адзначыць, што як Стары, так і Новы горад вельмі чыстыя.

Ветліва сустракала нас насельніцтва Стакгольма. Пры сустрэчах нам шчыра усміхаліся сотні незнаёмых тварау. Асабліва цесных зносін з насельніцтвам горада мы не мелі, перашкаджала няведанне шведскай мовы і хуткае перамяшчэнне з аднаго месца у другое. Мы даведаліся, што у Стокгольме вельмі цяжка атрымаць кватэру, і кошт яе вельмі вялікі. У горадзе многа беспрацоуных.

Праязджаючы па гораду, мы звярнулі увагу на вялікую колькасць веласіпедау.

Пасля знаёмства з горадам мы адправіліся да яго славутасці—будынка Ратушы. Упрыгожан ён у старадаунім нацыянальным стылі. Тут размяшчаецца гарадское упраулення. У зале пасяджэнняў муніцыпальнага сходу засядае 100 чалавек. Экскурсавод паведаміу нам, што у народзе іх называюць «сто тыранау».

З Ратушы мы накіраваліся у Нацыянальны музей. Пасля прагляду карцін і скульптур шведскіх мастакоу-рэалістау, якія пакінулі у нас добрае уражанне, мы знянацку трапілі у залы нечага дзікага і смехатворнага. Яшчэ у дзвярах, як-бы у жарт, экскурсавод папярэдзіу нас: «Глядзіце, не спужайцеся». Адразу мы не зразумелі, да чаго гэта адносіцца, але калі зайшлі у залу, разабраліся. Прыгожыя сцены Нацыянальнага музея был загаджаны нейкімі дзікімі мазкамі, точкамі, чорнымі плямамі. Гэта былі карціны сучасных буржуазных «мастакоу», Тут віселі карціны такіх шведскіх «мастакоу», як Пікасо, Маціс і іншых. Потым мы пашкадавалі, што зайшлі у гэты зал, таму што гэтым самым сапсавалі добрае уражанне, якое атрымалі раней.

Вечарам совецкія турысты наведалі Парк культуры і адпачынку—Скансен, дзе зрабілі прагулку па алеях парку і вярнуліся на цеплаход з воклічамі: «Мы зноу дома!».

На прыстані было многа праваджаючых—жыхароу Стакгольма. Яны прышлі у апошні раз паглядзець на прадстаунікоу Совецкага Саюза. Мы абмяняліся з імі сувенірамі, пелі любімыя рускія песні.

Апошнія поціскі рук. Цеплаход адчаліу ад Шведскіх берагоу...

А. С. ЛАКІЗА,
кандыдат філасофскіх навук.

(Працяг будзе)

Спартыйная СТАРОНКА Беларускага УНІВЕРСІТЭТА

* ПЕРШЫЯ СТАРТЫ. * *Яўгенія Гурвіч бярэ рэванш.* * ЗМАГАЮЦЦА ГІМНАСТЫ
* РЫХТАВАЦЦА ДА НОВЫХ СУСТРЭЧ!

НА СПАБОРНІЦТВАХ У ДНЕПРАПЕТРОЎСКУ

(заметкі удзельніка)

Паведамлене аб тым, што летам бягучага года мы будзем абараняць спартыуны гонар лепшай вышэйшай навучальнай установы Беларусі на спартакіядзе мацнейшых ВНУ краіны у Днепрапятроуску, па-рознаму сустрэлі ва універсітэце. Адны прывітальна, другія-ж з сумненнем хісталі галовамі: ці зможам мы быць дастойнымі працаунікамі праслауленых сталічных калектываў фізкультуры, такіх, як Маскоускі педагагічны інстытут, Маскоускі універсітэт імя М. В. Ламаносава, Кіускі дзяржауны універсітэт імя Т. Г. Шэучэнка і цэлы шэраг другіх. Ды і

лік студэнтау у іх не наш—больш за 10 тысяч.

Успаміналі выступленне у такіх спаборніцтвах у 1955 г. Беларускага дзяржаунага політэхнічнага інстытута. Выступалі яны няудала. Занялі адно з апошніх месц. Ці не такі удзел чакае і нас? Было над чым падумаць тым, хто памятным днём 31 мая сабрауся на збор фізкультурнага актыву. Гаварылі многа. Абмяркоувалі кожную дэталь. Нарэшце рашылі—паедзем. Будзем рыхтаваць каманды па усіх відах спаборніцтвау: лёгкай атлетыцы, гімнастыцы і плаванню.

Пачалися упорныя трэніроўкі. Бездакорна выконвалі парады трэнерау. У многіх-жа з нас былі трэцеразрадныя рэзультаты. За лета патрэбна было іх падняць да узроуню другога разраду. Залікжа па плаванню і лёгкай атлетыцы праводзіўся толькі па другому разраду, а па гімнастыцы—нават па першаму.

Многія з нас упершыню удзельнічалі ў такіх спаборніцтвах. І чым бліжэй падыходзіл спаборніцтвы, тым большым было хваляванне.

Вячэрнімі агнямі 9 жніуня праводзіу нас Мінск. Паволі губляліся у начной цемры карпусы універсітэта. З якім падаркам мы прыедзем назад? Аб гэтым думау кожны з нас, трыццаці сямі удзельнікау і трэнерау спартыўнай дэлегацыі універсітэта.

Днепрапятроўск—горад чыгуну і сталі, буйны студэнцкі цэнтр. Сустрэу нас радасна. Цяплом і хлопатамі днепрапятроуцаў мы былі акружаны увесь час нашага прабывання на спаборніцтвах. Нас забяспечыл бясплатным праездам на усіх відах транспарту, ахвотна шлі насустрач усім нашым запатрабаванням.

Спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы праходзіл на стадыёне «Металург», размешчаным на самай высокай частцы горада. З трох бакоу стадыён акружаюць трыбуны на 20 тысяч месц, а з чацзёртай, адкрытай,—від на горад, усеяны заводскімі трубамі, з сіняючай істужкай Дняпра ўдалечыні.

Першымі пачалі барацьбу спрынтэры. Добра стартавалі і прайшлі стометровую дыстанцыю студэнт гістарычнага факультэта Уладзімір Ціток, студэнтка геафака Марыя Лаурыновіч і Тамара Блахіна (філфак). Нягледзячы на моцны сустрэчны вецер, яны сумелі паказаць нядрэнны вынік і папасці у поуфінал. Уладзімір Ціток першым дау залік нашай камандзе—11,3 сек. Мы ад душы віншавалі нашых сяброу з першымі поспехамі. Яны усялл у нас перакананне у тым, што і мы таксама паспяхова будзем выступаць на спаборніцтвах.

Многа хваляванняу даставіл нам спаборніцтвы мацнейшых

бар'ерыстак—майстроу спорту Яугеніі Гурвіч, паступіушай у гэтым годзе на першы курс гістарычнага факультэта нашага універсітэта, і Нінэль Елісеевай (МДУ). У бегу на 80 м з бар'ерамі яны ужо раз сустракаліся на Спартакіядзе народау СССР у Маскве. Тады на 0,1 сек. уперадзе была Елісеева. Як-жа выступіць цяпер Яугенія? Ці зможа яна узяць рэванш? Здольныя спартсменкі дабіліся перамогі у поуфінале і цяпер будуць змагацца за першае месца у фінале.

Барацьба была упорнай. Амаль усю дыстанцыю яны ішлі радам. І толькі на фінішы Яўгенія сумела на 0,1 сек. апярэдзіць сваю сапернiцу. Час пераможцы 11 сек.—новы рэкорд БССР і значна вышэй нарматыва майстра спорту. Яшчэ адно першае месца заняла здольная спартсменка. Яна была мацнейшай у многабор'і—4228 ачкоу.

Добра прайшоў 200 метрау Уладзімір Ціток. Яго час—23,5 сек—паўтарэнне рэкорда універсітэта.

Рэкорды у бегу на 400 і 800 метрау удалося пабіць мне. Адразу 9 сек. скінуу з старога рэкорда у бегу на 1.500 м. Валерый Кіслік. Дзесятае асабістае месца заняу Алег Кузнечык у бегу на 5000 м.—16. 29,0 сек. Рэкордным быу лепшы кідок дыскабола Славы Чэмерыцкага. Дыск праляцеу 37,93 м. Рэкорд пабіт адразу больш чым на 3 м.!

У камандным залiку па лёгкай атлетыцы мы занялі дзевятае месца.

Спаборніцтвы па гімнастыцы праводзіліся на вольным паветры стадыёна «Дынамо», а плауцы аспрэчвалі асабіста-камандnае першынство ў адкрытым 50-метровым басейне коксахімічнага завода.

Нашы дзяучаты-гімнасткі выступілі паспяхова. Удзельніца Спартакіяды народаў СССР выдатніца вучобы філалагічнага факультэта Ларыса Патаповіч заняла сёмае месца—77,8 бала. Пятнаццатай была Ірына Шэкава—75,7 бала. Усяго-ж у спаборніцтвах удзельнічала 36 спартсменак. У камандным заліку нашы дзяучаты занялі сёмае месца. Але паколькі універсітэт не змог выставіць каманду мужчын, то мы аказаліся на агульным дзесятым месцы.

Горш выступалі плауцы. Сказалася адсутнасць вядучых спартсменау і дрэнныя умовы для трэніровак у Мінску. У басейне Інстытута фізічнай культуры, дзе нашы плауцы трэніруюцца, вада была паніжанай тэмпературы і некаторыя спартсмены захварэлі. Трэніроукі праводзілся у позні час. Наш басейн 25-метровы. Спаборніцтвы-ж у Днепрапятроуску праводзіліся у 50-метровым. Усё гэта дало свой адмоуны вынік. Плауцы занялі толькі 12 месца.

У агульнакамандным заліку па усіх відах спаборніцтваў мы аказаліся на 10 месцы, аставіушы ззаду яшчэ сем калектываў.

Радасныя, вярталіся мы у родны універсітэт. Радасныя ад таго, што ва упорнай барацьбе з мацнейшымі мы аказаліся іх дастойнымі працiўнікамі. На наглядным прыкладзе мы пераканаліся, што калі хочаш дабіцца добрых вынікаў, павінен як мага больш трэніравацца.

У будучым годзе у Кіеве будзе зноу праводзіцца Спартакіяда мацнейшых. Мы абавязкова прымем у ёй удзел. Думаем дабіцца лепшых вынікау. Для гэтага патрэбна нямнога: папоўніць каманду здольнай моладдзю і з першых дзён уключыцца у трэніроукі.

У Днепрапятроўску мы атрымалі нулі па прыжках у вышыню з шастом, бар'ерным бегу на 400 метрау у мужчын, штурханні ядра і кіданні кап'я у мужчын і жанчын. Не выставілі мы і каманду мужчын-гімнастаў. Усё гэта пагубна сказалася на выніках.

Да паездкі у Кіеу неабходна падрыхтаваць спартсменау-другаразраднікаў па гэтых відах. Магчымасці у нас ёсць, жаданне—таксама.

Анатоль КЛІЦУНОЎ,
студэнт IV курса геолага-геаграфічнага факультэта.

НА ЗДЫМКАХ: 1) Парад удзельнікаў Усесаюзных студэнцкіх спаборніцтваў 2). Поуфінальны забег на 100 метрау. Другім фінішыруе Ул. Ціток.

3) Заплыў на дыстанцыю 100 метрау вольным стылем. Другая справа Неля Пузікава, студэнтка III курса фізіка-матэматычнага факультэта.

4) Бег на 80 метрау з бар'ерамі. Вострая барацьба разгарэлася паміж Н. Елісеевай (крайняя злева) і Я. Гурвіч (яна бяжыць па трэцяй дарожцы). Перамагае Яугенія Гурвіч.

Рэдактар А. ВОЛК.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Бабруйская вул., корпус «А» пакой 13, тэл. 2-07-19

АТ 01320 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 1039 Тыраж 2000